ААТ «НАФТАН»: МАДЭРНІЗАЦЫЯ — ШЛЯХ ДА СУСВЕТНАГА ЎЗРОЎНЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта ў першую чаргу датычыцца старога корпуса прафілакторыя «Нафтана», дзіцячага садка № 5, інтэрната № 2, спартыўнага комплексу, футбольнага поля...

— Напрасцін сітуацыям з сыравінай адбіўся на праграмах рэканструкцыі і мадэрнізацыі вытворчасці?

— Безумоўна. Адсутнасць уласных сродкаў прыпыніла планцяжы на кантрактах, якія былі заключаны ў 2009 годзе. Адбыўся разрыў з банкамі, якія павінны былі прадаставіць крэдыты. Сёлета нам нават давялося паказваць фінансавую справаздачнасць не толькі за мінулы год, але і за першыя 4-5 месяцаў 2010 года. Зараз усе дамоўленасці, якія былі дасягнутыя летась, пераглядаюцца, карэктуюцца. Мы ўжо блізкія да падпісання крэдытных дагавораў з вядучымі банкамі Чэхіі і Аўстрыі. Вядуцца перамовы і з іншымі фінансавымі структурамі.

— З якім настроем падышлі да прафесійнага свята?

— Святы, а тым больш прафесійныя, прынята адзначаць працоўнымі поспехамі. Калі папярэднія гады для нашага акцыянернага таварыства былі даволі паспяховыя па ўсіх паказчыках, то змяненне ўмоў гаспадарання вымушае працаваць на панюжаных прадукцыйнасці: загрузка магутнасцяў складае каля 80 працэнтаў ад той, да якой мы прызвычаіліся. Тым не менш робяцца пэўныя захады для выпраўлення сітуацыі. Пачалі асвойваць альтэрнатыўныя віды

Гэтыя вялізныя рэактары прадназначаныя для ўстаноак гідраачысткі газа ў кожнай канструкцыі больш за 260 тон.

абсталявання — чэшская кампанія UNIS, і генеральны праекціроўшчык — ЗАТ «Нафтахімпраект» (Санкт-Пецярбург). Акрамя таго, мы завяршаем рэканструкцыю комплексу па вытворчасці араматыкі. Гэта вельмі сур'ёзны рамонт. Па-першае, маштаб кампаніі. З вытворчага цыклу адначасова выводзіцца шэсць тэхналагічных аб'ектаў, на якіх працуе каля 200 чалавек. Гэта ўстаноўкі па выпрацоўцы сумарных ксілолаў, артаксілолу, псеўдакумолу, бензолу, параксілолу і ксілолаў. На асноўнай устаноўцы па вытворчасці параксілолу правядзім замену сістэмы кіравання тэхналагічным працэсам і ўсе тыя работы, якія неабходныя для паспяховага функцыянавання комплексу на працягу трох гадоў. Па завяршэнні гэтага этапу мадэрнізацыі мы зможам атрымліваць ад 65 да 70 тыс. тон параксілолу ў год. А гэта асноўная сыравіна для ААТ «Магілёўхімвалакно». На іх, у сваю чаргу, завязана лёгкая прамысловасць. Таму рамонт комплексу араматыкі знаходзіцца на кантролі ў Саўміна.

— З якім настроем падышлі да прафесійнага свята?

— Святы, а тым больш прафесійныя, прынята адзначаць працоўнымі поспехамі. Калі папярэднія гады для нашага акцыянернага таварыства былі даволі паспяховыя па ўсіх паказчыках, то змяненне ўмоў гаспадарання вымушае працаваць на панюжаных прадукцыйнасці: загрузка магутнасцяў складае каля 80 працэнтаў ад той, да якой мы прызвычаіліся. Тым не менш робяцца пэўныя захады для выпраўлення сітуацыі. Пачалі асвойваць альтэрнатыўныя віды

Выконваючы абавязкі начальніка установкі АВТ-6 Генадзь ШЫЁНАК на ўчастку блока цеплаабмену.

Прыбыў чугуначны састаў з венесуэльскай нафтай.

Праграма рэканструкцыі і мадэрнізацыі «Нафтан 2010—2015» зацвярджана Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь. Яна ўлічвае ўсе нюансы, «Вянцом» праграмы з'явіцца будаўніцтва комплексу ўстановак па запавольнам каксаванні цяжкіх нафтавых рэштак. Адпаведнае рашэнне прынята. Адначасова ідзе падрыхтоўка да пуску самой устаноўкі каксавання павінна быць пабудавана ўстаноўка атрымання вадароду, устаноўка па ўтылізацыі серавадкацэнту метадам Кляўса з атрыманнем элементарнай серы, рэканструкцыя трох установак гідраачысткі дызельнага паліва. Дарэчы, атрыманы дызель будзе цалкам адпавядаць міжнароднаму стандарту Еўра-5. Згодна з праграмай, пуск комплексу запланаваны на канец 2013 года. Зараз ужо падпісаны асноўныя кантракты на пастаўку абсталявання з лідарамі ў яго вытворчасці.

Вяртаючыся да праграме развіцця зараз у стадыі рэалізацыі знаходзяцца 22 буйныя інвестыцыйныя праекты. Сюды ўваходзіць і будаўніцтва новай устаноўкі АТ-8 магутнасцю 6 млн тон нафты ў год. Ужо вызначаны пастаўшчык вуглевадародных сыравіны. Перапрацоўваем казахстанскія прамагонны мазут і пячное паліва ў дызель стандарту Еўра-5. Рыхтуемся да прыёму іншых відаў нафты. Тая ж венесуэльская нафта гатунку «Санта-Барбара» — асаблівая. Яна ўтрымлівае прыкладна ў паўтара раза больш светлых вуглевадародаў, чым расійская URALS. Таму пра пэўную загрузку ўсяго абсталявання не даводзіцца гаварыць у тым ліку і па гэтай прычыне: па светлых нафтапрадуктах у нас і так будзе перагрузка. Такім чынам, загрузка ў 85-90 працэнтаў дазволіць выпускаць такую ж колькасць светлай прадукцыі, як і пры поўнай загрузцы нафтай маркі URALS.

— База захоўвання нафты завода павялічваецца пад гэтыя задачы?

— Гэта стратэгічная задача. З пункту гледжання энергетычнай бяспекі мець вялікі запас сыравіны выгадна. У выпадку нейкіх непрадбачаных абставінаў з пастаўкамі, гэтую нафту можна будзе з поспехам выкарыстоўваць. У той жа Еўропе на падобных прадпрыемствах маецца месячны запас як сыравіны, так і нафтапрадукцыі. Вядома, гэта дарагое задавальненне, аднак цалкам апраўданае. Нават калі форсмажор здарыцца раз у сто гадоў.

Ад сябе заўважу, што ў найпростай сітуацыі, якая склалася на пачатку года, тыя арганізацыі, перад якімі ставілася задача па альтэрнатыўных пастаўках нафты, справіліся з ёй бліскуча. Павярнуць плыні нафты з Лацінскай Амерыкі, выбудаваць лагістычны ланцужок, наладзіць эфектыўную перапрацоўку, адгрузку, продаж таварнай прадукцыі ў такія сціслія тэрміны вельмі складана. Мяркуйце самі: гаварыць пра венесуэльскую нафту мы пачалі вясной, і ўжо ў маі пайшлі першыя пастаўкі праз поўдзень, а ў ліпені — праз поўнач. Гэта гаворыць пра мабільнасць, кіруемасць усіх звёнаў ланцуга і правільнасць прынятых рашэнняў. Вынік відавочны — загрузкі павышаюцца, прадпрыемствы атрымліваюць прыбытак, плацяць падаткі...

«ПА ЗАВЯРШЭННІ ПРАГРАМЫ РЭКАНСТРУКЦЫІ І МАДЭРНІЗАЦЫІ ВЫЙДЗЕМ НА СУСВЕТНЫ ЎЗРОВЕНЬ»

Будаўніцтва на ААТ «Нафтан» набыло сапраўды грандыёзны размах.

— Сёння ў рэканструкцыі і мадэрнізацыі прадпрыемстваздзейнічана 18 генпадрадных арганізацый і 32 субпадрадчыкі, — расказаў **начальнік упраўлення будаўніцтва, рэканструкцыі і мадэрнізацыі Сяргей КУЗНЯЦОЎ**. — На розных стадыі будаўніцтва знаходзяцца 52 аб'екты, на якіх працуе каля 800 чалавек. Асноўныя з тых, што будуць здадзены ўжо сёлета, — гэта ўстаноўка нізкатэмпературнай ізамерызацыі «Пенекс» і вакуумны блок устаноўкі «Вісбрэкінг». Больш як на палову гатовы парк для захоўвання звадкаваных вуглевадародаў і эстакада для іх зліву.

Яшчэ адзін грандыёзны аб'ект — пашырэнне базы захоўвання нафты. Дадаткова ўстанаўліваюцца тры рэзервуары на 30 тыс. кубаметраў кожны і два на 20 тыс. кубаметраў. Гэта дазволіць стварыць стратэгічны запас сыравіны.

Калі гаварыць пра больш аддаленую перспектыву, то зараз усе работы накіраваны на тое, каб падрыхтаваць дакументацыю пад будаўніцтва комплексу запаволенага каксавання. Адначасова трэба будзе ўвесці пяць установак!

З 2005 года заканадаўства ў галіне будаўніцтва стала больш жорсткім. Мноства працэдурных пытанняў прыйшло да зацягвання тэрміну? будаўніцтва. Нам у гэтым сэнсе вельмі дапамог Указ кіраўніка дзяржавы, згодна з якім ААТ «Нафтан» можа без правядзення канкурсаў напрамую прыцягваць арганізацыю «Нафтазаводмантаж», якая выдатна ведае наш завод і некалі менавіта пад яго і стваралася, і ў якасці праектнай арганізацыі — Гродзенскі інстытут азотнай прамысловасці, які ўваходзіць у склад канцэрна «Белнафтахім».

«МЫ ЦАЛКАМ АДАПТАВАЛІСЯ ДА НОВАГА ГАТУНКУ НАФТЫ»

— Намі падпісаны кантракт па забеспячэнні прыёмкі і перапрацоўкі 160 тыс. тон нафты гатунку «Санта-Барбара», — паведаміў **намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці Сяргей АЛТУХОЎ**. — Сыравіна ідзе з эстонскага порта. Пастаўшчык — Беларуская нафтавая кампанія. З пункту гледжання нафтаперапрацоўкі, гэтая сыравіна ўзбагачана светлымі нафтапрадуктамі — у адной тоне патэнцыял бензіну, дызелю, газы вышэй, чым у нафце гатунку URALS. Удзельныя выдаткі на перапрацоўку гэтых гатункаў нафты адносна невысокія, а выхад таварнай, больш дарагой прадукцыі ў «Санта-Барбары» вышэй.

Наша задача была забяспечыць рытмічную прыёмку, перапрацоўку і адгрузку таварнай прадукцыі. Вельмі важна было намацаць тэхналагічны рэжым, адаптаваць нашы магутнасці да новага гатунку сыравіны. З чым мы пасяхова і справіліся. Праведзеная вялікая работа і тэхналагамі, і лабаратарыямі, іншымі службамі прадпрыемства. Нейкіх праблем, звязаных з перапрацоўкай венесуэльскай нафты, не ўзнікла. З пункту гледжання паказчыкаў работы прадпрыемства, як пастаўкі — пазітыўны момант. Таму мы за тое, каб перапрацоўваць яшчэ большыя аб'ёмы «Санта-Барбары». І рыхтуемся да гэтага тэхналагічна. Зараз адпаведныя службы завода разлічваюць тую аптымальную колькасць нафты, якую мы зможам прыняць і перапрацаваць. Давесці да 100 працэнтаў загрузку толькі за кошт «Санта-Барбары» нельга. Наш завод, як і любы іншы, арыентаваны на пэўны гатунак сыравіны. Таму аблегчаную нафту мы можам перапрацоўваць толькі ў сумесі з іншай традыцыйнай для нас сыравінай у суадносінах 25 на 75 працэнтаў.

Урадам і кампэнсіруецца пастаўлена задача павялічыць загрузку магутнасцяў. Мы разглядаем усе варыянты яе выканання. Гэта і дабаўленая нафта, і набыццё ўласнай сыравіны, і альтэрнатыўныя віды сыравіны... Мазут і пячное паліва былі актуальныя, калі завод быў недагружаны на асноўным відзе сыравіны, і дапамаглі перажыць вясенне-летні перыяд. З павелічэннем загрузкі па нафце актуальнасць загрузкі другасных прадпрацэсаў будзе знікаць.

У руках лабаранта Ірыны ВЯЧЭРСКАЙ узор нафты «Санта-Барбара», якая прыбыла ў Наваполацк.

У цэнтральнай заводскай лабараторыі разгонку сыравіны і фракцый праводзіць лабарантка Ала ІЗМЕРЫ Валянціна ШАНЁНАК.

Укладка электракабеля на новай эстакадзе.

Начальнік тавараснавання цэха № 8 Сяргей ЯЎТУШЫК:

«ЗА ДЗЕНЬ ПРЫМАЕМ КАЛЯ 100-120 ВАГОНАЎ «САНТА-БАРБАРЫ»

— Апошнім часам мы прымаем не толькі нафту, але і іншыя альтэрнатыўныя віды сыравіны. Вось нядаўна пачалі працаваць з нафтай з Венесуэлы — у Эстонію прыбыў ужо другі танкер. Не выключана, што да канца года графік паставак яшчэ больш пашырыцца. Калі казаць пра «Санта-Барбару», у сярэднім за дзень мы прымаем каля 100-120 вагонаў нафты.

Басейн «Садок», які належыць ААТ «НАФТАНУ», любімае месца заняткаў аматараў спорту ўсіх узростаў.

Намеснік генеральнага дырэктара Мікалай КАЛБАСЕНКА:

«НЯГЛЕДЗЯЧЫ МЫ ЗАХАВАЛІ НАЙЛЕПШЫЯ»

— Сацыяльная сфера на прадпрыемстве вельмі значная: дзве паліклінікі, санаторый, палац культуры, восем дзіцячых садкоў, інтэрнаты, летнікі, базы адпачынку, некалькі спартыўных комплексаў, тэнісныя корты, — расказаў Мікалай Аляксандравіч. — Як бы ні было складана, мы практычна ўсё захавалі. За апошні час капітальна адрамантаваны дзіцячы садок № 5 — першы садок прадпрыемства, спартыўны комплекс, адзін з карпусоў санаторыя. У пачатку года пасля рамонту адкрыўся адзін з заводскіх інтэрнатаў. Укладваюцца грошы і ў загарадныя аб'екты: аздараўленчы дзіцячы лагер і турыстычную базу.

За апошнія два гады ўведзены ў эксплуатацыю або ўводзіцца ў бліжэйшай перспектыве шэраг мадэрнізаваных і новых вытворчых аб'ектаў. Размова ў першую чаргу ідзе пра ўстаноўку ізамерызацыі бензіну і ўстаноўку першаснай перапрацоўкі нафты. Гэта запатрабавала павелічэння штатнай колькасці работнікаў. Пад новыя праекты на прадпрыемстве створана больш за 100 працоўных месцаў. Спецыялісты ўжо падабраныя і праходзяць дападрыхтоўку на агульніх дзейных вытворчасцях завода.

Кадры ў асноўным падбіраем у мясцовых прафільных установах — вучылішчы, тэхнікуме і Полацкім дзяржаўным універсітэце. Апошнім часам сталі запрашаць лепшых выпускнікоў сталічных ВНУ — Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта і Беларускага

ААТ «Нафтан» па ідэалагічнай рабоце, кадрах і сацыяльным развіцці

НА ЦЯЖКАСЦІ, ЎСЮ «САЦЫЯЛКУ»

нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — інжынераў-тэхналагаў, інжынераў-механікаў, інжынераў-энергетыкаў... Ахвотных працаваць на «Нафтане» па-ранейшаму шмат. І ў гэтай сітуацыі конкурсная сістэма, уведзеная ў свой час, выручае. Суб'ектыўны падыход пры адборы спецыяліста цалкам выключаны. Таму штучна працоўных дынастый, як гэта было ў савецкія часы ды і зараз бывае на іншых прадпрыемствах, не ствараецца. Напрыклад, сёлета мы падалі заяўкі ў названыя вышэй навучальныя ўстановы на 86 маладых спецыялістаў. Умова — 10 лепшых па рэйтынгу, і 11-ты ўжо не патрапіць, чым бы ёмкам ён ні быў. Спецыялісты, якія прыходзяць на агульных падставах, праходзяць тэсціраванне.

Са свайго боку такі жорсткі падыход пры адборы кампенсуецца годнай аплатай працы і важкім сацыяльным пакетам. Так, кожнаму маладому спецыялісту, які мае патрэбу, прадастаўляем месца ў інтэрнаце. Створаць сям'ю — далзім пакой у сямейным інтэрнаце. Для маладых спецыялістаў — асобная льготная чарга на будаўніцтва жылля. Чакаць пачатку закладкі дома даводзіцца каля 5 гадоў. Льготны крэдыт у 5 працэнтаў гадавых на 20-25 гадоў дапамагае атрымаць завод. Розніцу паміж працэнтамі банка і назвай стаўкай таварыства бярэ на сябе.

Натуральна, кожны работнік мае магчымасць атрымаць якаснае медыцынскае абслугоўванне, санаторнае лячэнне, прычым не толькі ў нашым санаторыі... Аб'яднанне мае ўсю інфраструктуру для заняткаў работнікаў фізкультурай і спортам — было б жаданне. І ўсё гэта ці цалкам бясплатна, ці па вельмі льготных цэнах. Напрыклад, за пуцёўку ў санаторый «Нафтана» даводзецца заплаціць усяго 10 працэнтаў ад яе кошту.

ДЗЯЦІНСТВА ПАВІННА БЫЦЬ ШЧАСЛІВЫМ!

Старэйшы садок завода знаходзіўся на рэканструкцыі два гады. Прычым увесь гэты час бацькі з нецярпеннем чакалі яго адкрыцця і запісвалі дзетак у групы. Тут яны не шматлюдныя: ясельная — 10 дзетак, у астатніх па 20. Патрапіць у выдатна абсталяваную, укамплектаваную лепшымі педагагічнымі кадрамі ўстанову імкнуліся многія. Адпаведна перавага аддаецца дзецям работнікаў і ўнукам ветэранаў «Нафтана».

— Нягледзячы на тое, што нашаму садку сёлета спаўняецца ўжо 47 гадоў, пасля такой выдатнай рэканструкцыі яго проста не пазнаць — выглядае як новы, — расказала **выхавальніца Наталля Валянцінаўна КІРЭЙ**, якая працуе тут ужо 20 гадоў. — Зроблена ўсё, што толькі магчыма, прычым на еўрапейскім узроўні. Гэта тычыцца як самога будынка, тэрыторыі, пакояў, так і абсталявання, спартыўных пляцовак і інвентару, цацак...

— Камфорт максімальны, — уключылася ў размову **намеснік загадчыцы садка Наталля ГУР**. — Дзякуючы «Нафтану», створаны ўсе ўмовы для гарманічнага развіцця асобы. Падчас урачэбнага адкрыцця намеснік генеральнага дырэктара Мікалай Калбасенка і старшыня прафкама Вольга Рагоўская падарылі дзеткам мультымедыйны праектар. Цяпер і мульцікі «круцяць», і спецыяльныя праграмы, якія развіваюць...

На нашых вачах дзеці асвойваліся стол для гульні ў тэніс, гулялі ў пясочніцах, разам з інспектарам ДАІ вывучалі правілы дарожнага руху на спецыяльна абсталяванай пляцоўцы, «абжывалі» дыхтоўна афармленыя домікі-верандыі... Як удакладніла **эканаміст аддзела сацыяльнага развіцця Вольга ТАБАКОВА**, у дзіцячых садках аб'яднання дзеці атрымліваюць за кошт прадпрыемства 20-працэнтную надбаўку да нормаў харчавання. Паводле яе слоў, на «Нафтане» ўвогуле асаблівая ўвага надаецца клопату пра дзяцей. Вялікай папулярнасцю карыстаецца адпачынак у летніх аздараўленчых лагерах «Ленінцы» і «Камета». Згодна з калектыўным дагаворам, кожны работнік заводаа мае магчымасць адправіць сваіх дзетак на адпачынак у адзін з іх. Пры гэтым заплаціць давядзецца ўсяго 15 працэнтаў ад кошту пуцёвкі. У летніках завода створаны выдатныя ўмовы: шасціразовае харчаванне, кожны корпус мае гарачае водазабеспячэнне, а ў «Ленінцы» маецца яшчэ і крыты басейн...

Будынак дзіцячага яслі-сада № 5 старэйшы за карпусы «Нафтана», але выглядае выдатна, бо нядаўна быў грунтоўна рэканструяваны. Тут мы пазнаёміліся з выхавальніцай Аленай СІНІЦЫНАЙ-КАСАРЭНКА і адным з яе падапечных чатырохгадовым Ягоркам БАРАВЫМ. Старшы інспектар ДАІ Сяргей КОЖУХ патраліў у аб'ектыў невыпадкова: на тэрыторыі гульнявых пляцовак створаны выдатны аўтагарадок, дзе малыя знаёмяцца з правіламі для пешаходаў.

Старшыня асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» Генадзь НЯВЫГЛАС прыехаў да нафтанаўскіх спартсменаў з падарункамі.

Санаторый першай катэгорыі «НАФТАН» ведае кожны нафтаперапрацоўшчык.

Намеснік галоўнага ўрача Юліі КАРАЛЁВА у дапаўненне да інтэрв'ю падзмастравала цудоўныя арэхаві: гэтыя радкіх кветкі ўпрыгожваюць тутэйшы інтэр'ер.

Медсястра Александра КОРСАК параліла нам сфатаграфаваць сучаснае абсталяванне, якім можаганарыцца нават самая буйная лячэбная установа: магнітатурбатрон ЭОЛ.



Будуюцца рэзервуары для захоўвання нафты ёмістасцю 20 і 30 тысяч кубаметраў. На ўзвядзенні новых канструкцый працуе мантажнік Мікалай ФІНДРЫК.



На будаўніцтве вакуумнага блоку ўстаноўкі Вісбрэкінг.

Санаторый з прыстаўкай «унікальны»

— Наш санаторый разлічаны на адначасовае знаходжанне 140 чалавек, — расказала **намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай рабоце Юлія КАРАЛЁВА**. — У год мы прымаем 17 заездаў. У асноўным аздараўліваюцца работнікі нашага аб'яднання: ААТ «Нафтан», завода «Палімір», а таксама ветэраны вытворчасці.

У верасні 2009 года запрацавала рэканструкцыя першага корпуса санаторыя. Было закуплена новае ўнікальнае абсталяванне... Нам сапраўды ёсць чым пахваліцца: такое сучаснае і разнастайнае абсталяванне, камфортныя умовы пражывання знайсці цяжка. Гонар нашага санаторыя — магнітатурбатрон. З яго дапамогай праводзіцца магнітатэрапія. Асноўнае паказанне для лячэння — анкалагічныя захворванні на любой стадыі. На шчасце, вялікай колькасці анкахворых у нас няма, таму магнітатурбатрон мы актыўна выкарыстоўваем для лячэння артэрыяльнай гіпертэнзіі. Вынікі вельмі добрыя: ідзе стабілізацыя ціску, паляпшаецца псіхаэмацыйны фон, пацыенты лепш спяць... Дапамагаем і людзям, якія маюць праблемы з апорна-рухальным апаратам: астэахандрозы, грыжы — сапраўды біч апошніх дзесяцігоддзяў.

Вельмі актуальны і нават модны накірунак у лячэнні — крыятэрапія. Мы маем устаноўку агульнай крыятэрапіі нямецкай вытворчасці і ўстаноўку для лакальнай крыятэрапіі. Калі апошняя больш выкарыстоўваецца ў касметалогіі, лячэнні апорна-рухальных захворванняў, хірургіі — пры выцятых месцах і траўмах, то агульная крыятэрапія выкарыстоўваецца для павышэння супрацівляльнасці арганізма да інфекцый, узняцця агульнага тонусу. Сярод медыцынскіх паказанняў — хваробы апорна-рухальнага апарату, у прыватнасці, рэўматоідны артрыт.

Працуе ў нас і кабінет бемертэрапіі, укамплектаваны швейцарскім абсталяваннем. Калі звычайныя фізіятэрапеўтычныя апараты працуюць з велічынёй індукцыі ў міліцэслах, то ў бемертэрапіі велічыня індукцыі вымяраецца ў мікратэслах. Гэта значыць, уздзеянне на арганізм мінімальнае. Тым не менш, мы бачым добры тэрапеўтычны эфект і ў неўралогіі, і пры лячэнні скураных захворванняў.

Для лячэння шэраг станаў

ноўку агульнай крыятэрапіі нямецкай вытворчасці і ўстаноўку для лакальнай крыятэрапіі. Калі апошняя больш выкарыстоўваецца ў касметалогіі, лячэнні апорна-рухальных захворванняў, хірургіі — пры выцятых месцах і траўмах, то агульная крыятэрапія выкарыстоўваецца для павышэння супрацівляльнасці арганізма да інфекцый, узняцця агульнага тонусу. Сярод медыцынскіх паказанняў — хваробы апорна-рухальнага апарату, у прыватнасці, рэўматоідны артрыт.

Працуе ў нас і кабінет бемертэрапіі, укамплектаваны швейцарскім абсталяваннем. Калі звычайныя фізіятэрапеўтычныя апараты працуюць з велічынёй індукцыі ў міліцэслах, то ў бемертэрапіі велічыня індукцыі вымяраецца ў мікратэслах. Гэта значыць, уздзеянне на арганізм мінімальнае. Тым не менш, мы бачым добры тэрапеўтычны эфект і ў неўралогіі, і пры лячэнні скураных захворванняў.

Для лячэння шэраг станаў

мы з поспехам выкарыстоўваем і беларускія апараты «Артаспокі» і «Уніспок».

Шырока выкарыстоўваем водалячэнне: мінеральна-салявыя ванны, ванны з аксідам торфу, кантрасныя ванны, падводны душ-масаж... Не так даўно закупілі спа-капсулу, якая дазваляе праводзіць падводны масаж з інфрачырвонай саўнай, аромасаўнай, хромацэрапіяй. Таксама маем добра аснашчаны касметалагічны кабінет. Зараз пачалі атрымліваць касметалагічныя сродкі. Мяркую, яны будуць карыстацца велізарнай папулярнасцю не толькі сярод работнікаў прадпрыемства.

У санаторыі сфармірована стаматалагічнае аддзяленне. Працуюць тры стаматолагі-артапеды, два стаматолагі-тэрапеўты, маем уласныя зубатэхнічную лабараторыю, рэнтгеналагічны кабінет... Пацыенту не трэба бегаць па паліклініках.

Практыкуем нетрадыцыйныя віды лячэння: іголкарафлексатэрапію, акупунктуру. Маючы такую шыкоўную базу, мы аддаём перавагу немедыкаментозным відам лячэння.

Да нас прыходзяць пацыенты заводскіх паліклінік. Незалежна ад наяўнасці пэўных паказанняў, мы імкнёмся ўсім правесці поўнае абследаванне. Калі гэта ўльтразвук, то для жанчын — і даследаванне малочнай залозы, для мужчын — прастата. Тое ж і з даследаваннем сэрца, іншых органаў. Дзякуючы такому падыходу, выявілі шмат паталогій, у тым ліку і анкалагічных захворванняў. За 6 месяцаў — 15 выпадкаў. Пацыенты былі своечасова накіраваныя ў Полацкі анкадыспансэр і паліклінікі для ўдакладнення дыягназу. Адзін з пацыентаў трапіў да нас «падлячыцца» без нейкіх спецыяльных скаргаў. Праведзенае даследаванне своечасова выявіла ў яго цяжкае небяспечнае захворванне. Зараз чалавек праапераваны і добра сябе адчувае. Прыходзіў, дзякаваў за дапамогу.

З сакавіка 2010 года мы запусцілі новыя віды дзейнасці: рэнтгеналагічную дыягностыку і касметалогію. Увогуле нашы санаторый аказвае 14 відаў паслуг.

За такія ўнікальныя магчымасці яблікі дзякуй трэба казаць кіраўніцтву «Нафтана». Мы маем магчымасць падвышаць выставы, дзе прадстаўлена найноўшае медыцынскае абсталяванне. Галоўны ўрач санаторыя — Аляксандр Сапрокін — прагрэсіўны кіраўнік, які імкнецца апошнія дасягненні медыцыны выкарыстоўваць на практыцы. Таму, калі мы можам абгрунтаваць неабходнасць таго ці іншага абсталявання, прадпрыемства заўсёды ідзе нам насустрач... Ганарыцца наш санаторый і спецыялістамі, якія тут працуюць. 92 працэнты нашых урачоў і 77 працэнтаў сярэдняга медперсаналу маюць кваліфікацыю.

Работніцы гаспадарчага цэха Юлія КУРЧЫНСКАЯ і Алена СКАРЫНА з гонарам за сваю справу паказалі нам прыгожыя кветнікі, якія яны дагледзелі. Здымкі побач гаворяць самі за сябе: строгі тэхналагічны пейзаж прадпрыемства нафтаперапрацоўчыкі упрыгожылі ў поўным сэнсе слова прыродай.

Матэрыялы падрыхтавалі Сяргей ПРОТАС, Віктар ПАЗНЯКОЎ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

УНП 100155376